1. *Леви-Брюль, Л.* Сверхъестественное в первобытном мышлении / Л. Леви-Брюль. – М. : Педагогика-Пресс, 1994. – 608 с.

2. *Вучетич, Е. В.* Художник и жизнь / Е. В. Вучетич. – М. : Изд. Акад. художеств СССР, 1963.

3. *Конт, О.* Дух позитивной философии / О. Конт. – М. : Директ-Медиа, 2002. – 152 с.

4. *Леви-Стросс, К.* Первобытное мышление / К. Леви-Стросс ; пер., вступ. ст. и прим. А. Б. Островского. – М. : Республика, 1994. – 384 с.

5. Памятник белорусскому солдату в Берлине // Беларуская думка. – 2004. – № 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАКУМЕНТЫ ФОНДА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ РАДЫ ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ «БЕЛАРУСКАЕ ДОБРААХВОТНАЕ ТАВАРЫСТВА АХОВЫ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ» ЯК КРЫНІЦА ПА ВЫВУЧЭННІ АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ

***А. Я. Паўлава,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Вялікая роля ў галіне захавання гісторыка-культурнай спадчыны ў сённяшні час належыць намаганням грамадскасці. «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» з'яўляецца адной са старэйшых грамадскіх арганізацый Беларусі. Яно было заснавана ў адпаведнасці з рашэннем ўрада БССР і партыйных кіруючых органаў у 1965 г. [11, арк. 80–82]. Да сярэдзіны 1960-х гг. аховай помнікаў гісторыі і культуры БССР займаліся Міністэрства культуры і Дзяржкамітэт Савета Міністраў па справах будаўніцтва (Дзяржбуд БССР). Аднак іх дзейнасць з прычыны малой колькасці супрацоўнікаў не была эфектыўнай [1, арк. 22].

Распараджэннем Савета Міністраў БССР ад 3 сакавіка 1967 г. былі вызначаны структурныя падраздзяленні БДТАПГК [2, арк. 1–2]. У яго склад увайшлі абласныя аддзяленні, былі вылучаны секцыі архітэктуры, мастацтва, гісторыі, археалогіі, этнаграфіі і маладзёжная. Мэтамі і задачамі Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры па сённяшні дзень з'яўляюцца: выяўленне і ўлік помнікаў гісторыі і культуры Беларусі на тэрыторыі рэспублікі і за яе межамі, распаўсюджанне сярод насельніцтва ведаў аб помніках і павагі да культурнай спадчыны; ажыццяўленне грамадскага кантролю за выкананнем прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі, службовымі асобамі і грамадзянамі заканадаўства аб ахове і выкарыстанні помнікаў; прапаганда ведаў аб помніках і заканадаўстве аб іх ахове і выкарыстанні.

Багаты збор дакументаў аб дзейнасці БДТАПГК сабраны ў Беларускім дзяржаўным архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі. Архіўны фонд № 297 «Рэспубліканскага савета дабраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» налічвае 457 адзінак захавання за перыяд з 1966 па 2007 г. Большасць крыніц адносіцца да савецкага перыяда і першай паловы 1990-х гг. Гэта дакументы справаводства цэнтральных кіруючых органаў і рэгіянальных аддзяленняў грамадскага аб'яднання, дакументы Бюро прапаганды ведаў аб помніках гісторыі і культуры. Захаваліся аналітычныя даведкі пра стан помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі рэспублікі і матэрыялы аб працы над стварэннем «Звода помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» [9, арк. 119–125].

Дакументы фонда адлюстроўваюць дзейнасць Таварыства па асноўных вызначаных кірунках. Справаздачы цэнтральнага і абласных саветаў, а таксама раённых аддзяленняў Таварыства аб рабоце, дакументы аб рабоце секцый дазваляюць асэнсаваць поспехі ў галіне пошуку, уліку і арганізацыі захавання гісторыка-культурнай спадчыны, прасачыць ход рамонтна-рэстаўрацыйных работ на знакавых аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны, вызначыць ас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ноўныя ўзнікаючыя праблемы (выкарыстанне не па прызначэнні, недастатковае фінансаванне, адсутнасць наглядальнікаў і арэндна-ахоўных дамоў, ахоўных зон вакол аб’ектаў спадчыны, абыякавае стаўленне мясцовых уладаў) [3, арк. 31, 43; 4, арк. 27, 30, 66; 10, арк. 18, 45; 17, арк. 62 ].

Важным аспектам паспяховай работы па захаванні помнікаў гісторыі і культуры ў савецкі час можна назваць арганізацыю шэфства прадпрыемстваў, арганізацый і устаноў над вызначанымі аб’ектамі гісторыка-культурнай спадчыны [3, арк. 43; 4, арк. 31]. Добрым пачынаннем стала правядзенне штогадовых тыдняў па добраўпарадкаванні помнікаў [9, арк. 132–158].

Крыніцы даказваюць, наколькі сур’ёзна Таварыства ставілася да пытання захавання і рэстаўрацыі помнікаў археалогіі [19]. На першым з’ездзе БДТАПГК У. Д. Будзько падняў пытанні аховы помнікаў археалогіі: «...недапушчальна, каб падвяргаліся разбурэнню помнікі старажытнасці <...>. З 6000 помнікаў пад аховай дзяржавы знаходзіцца толькі 280». Спадчына старажытнасці актыўна выкарыстоўвалася ў якасці кар’ераў па здабычы пяску або жвіру, маюцца звесткі аб паселішчах каменнага веку і паселішчаў ранняга жалезнага веку, якія былі знішчаны ў выніку узворвання, пракладкі каналаў і торфараспрацовак (Навасёлкі ў Петрыкаўскім, Востраў у Пінскім, Снітава ў Іванаўскім, Зарэчча ў Бярозаўскім раёнах) [1, арк. 14–16].

Так, дакументы Таварыства сведчаць, што правядзенне будаўнічых работ рэгулярна ставіць пад пагрозу захаванне помнікаў археалогіі, напрыклад, у Пінску і Слоніме [7, арк. 39]. Акадэмічная навуковая супольнасць рэгулярна звярталася да кіраўніцтва Мінгарвыканкама з тлумачэннямі аб неабходнасці даваць дазвол на правядзенні ўсіх земляных работ толькі пасля вывучэння ўчасткаў археолагамі [6, арк. 1–21; 11, арк. 47–49].

Асабліва ўскладнілася сітуацыя ў першай палове 1990-х гг. падчас пераўтварэнняў першых гадоў незалежнасці. Рэгулярна ўзнікалі спрэчкі паміж БДТАПГК і мясцовымі органамі ўлады: без узгаднення з арганізацыямі, адказнымі за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, грамадзянам сталі выдавацца дазволы на індывідуальнае будаўніцтва на месцы археалагічных помнікаў, бо апошнія не былі нанесены на карты землекарыстання. Матэрыялы Таварыства сведчаць аб шматлікіх выяўленых парушэннях у Віцебску, Пінску, Слуцку. Кіраўніцтва БДТАПГК лічыла, што Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь не забяспечвала належным чынам згуртаванне грамадскіх і навуковых намаганняў для перадухілення падобнай сітуацыі. Адпаведна, у пастанове II пленума БДТАПГК у 1992 г. была запісана просьба да Савета Міністраў краіны заслухаць на пасяджэнні ўрада даклад Міністэрства культуры аб стане аховы помнікаў з адначасовым садакладам кіраўніцтва БДТАПГК [17, арк. 1–27].

Сярод цікавых дакументаў аб неабходнасці захавання археалагічных помнікаў можна вызначыць ліст да кіраўніцтва БДТАПГК загадчыка Ленінградскага аддзялення Інстытута гісторыі Акадэміі навук СССР, прафесара М. К. Каргера з просьбай правесці тлумачальную работу з кіраўніцтвам «Беларусьфільма» аб неабходнасці асцярожнай дзейнасці падчас здымання кінастужкі на тэрыторыі замка ў Навагрудку [6, арк. 1–21].

Як сведчаць крыніцы, на працягу ўсяго перыяда сваёй дзейнасці Таварыства асабліва пільную ўвагу звяртае на ўзаемадзеянне з мясцовымі органамі ўлады па пытаннях захавання помнікаў архітэктуры. Члены Таварыства, эксперты (гісторыкі, архітэктары, мастацтвазнаўцы) стараліся данесці да чыноўнікаў важнасць захавання не столькі асобных аб’ектаў, колькі гістарычнай забудовы ў цэлым, інакш захаваныя будынкі будуць нагадваць музейныя экспанаты сярод сучасных дамоў. Пры гэтым неабходна было ствараць навуковую гістарычна-архітэктурную экспазіцыю [3, арк. 79–81]. Патрэбы мясцовага развіцця часам прыводзілі да знішчэння архітэктурных аб’ектаў. Яскравым прыкладам з’яўляецца сітуацыя ў г. Орша, дзе ў 1969 г. з дазволу намесніка старшыні райвыканкама (які адначасова з’яўляўся і старшынёй мясцовага аддзялення БДТАПГК) былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разбураны 2 помнікі культавага дойлідства 18 ст. [3, арк. 31]. У 1971 г. кіраўніцтва Мінаблвыканкама прапанавала выключыць са спіса помнікаў былы палац Радзівілаў (1780), адзіны ў Беларусі помнік грамадзянскага будаўніцтва, які спалучаў рысы драўлянага і каменнага дойлідства. У якасці прычыны называўся дрэнны стан будынка, хаця члены камісіі па даследаванні становішча будынка, спецыялісты па архітэктуры лічылі магчымым правесці паспяховую рэстаўрацыю [7, арк. 80–84]. Сур'ёзнымі прычынамі разбурэння помнікаў мясцовага значэння называлася адсутнасць непасрэдных гаспадароў аб'ектаў і выкарыстанне будынкаў не па назначэнні [4, арк. 29–30; 14, арк. 224]

Сярод дакументаў фонду захавалася шмат матэрыялаў аб барацьбе Таварыства і грамадскай супольнасці за захаванне знакавых архітэктурных помнікаў у сталіцы і рэгіёнах. Так, згодна з меркаваннем кіраўніцтва Мінгарвыканкама, захаванне вуліцы Няміга і гістарычнай забудовы лічылася немагчымым з прычыны неабходнасці транспартнай разгрузкі цэнтра горада. Аднак пасля публікацыі газеты «Праўда», звароты вядучых гісторыкаў, архітэктараў, мастацтвазнаўцаў да кіраўніка ЦК КПБ П. М. Машэрава, у Вярхоўны Савет і Дзяржбуд БССР кіраўніцтва горада пагадзілася даручыць «Мінскпраекту» разгледзець перспектывы захавання часткі гістарычнай забудовы [6, арк. 1–21]. У тым жа 1969 г. дзякуючы намаганням БДТАПГК атрымалася захаваць сядзібу мастака І. Рэпіна «Здраўнёва» ў Віцебскім раёне, над якой навісла пагроза трапіць у кар'ер даламітавых нарыхтовак [6, арк. 43–52]. Адным з варыянтаў захавання помнікаў культавага дойлідства Таварыства прапаноўвала ствараць у гэтых будынках музейныя ўстановы: музей гісторыі г. Мінска ў Кацярынінскай царкве і музей гісторыі г. Віцебска ў Благавешчанской царкве [6, арк. 28–31; 9, арк. 119–125].

Пільны клопат выказвалі члены Таварыства і па пытаннях аховы і папулярызацыі помнікаў драўлянай архітэктуры. Сярод матэрыялаў фонда захавалася аналітычная даведка за 1984 г. аб стане помнікаў драўлянага дойлідства і



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мерах па іх захаванні. У ёй ўказваецца на неабходнасць папулярызацыі гэтага віду помнікаў праз стварэнне Музея народнай архітэктуры і быту. Звярталася ўвага на неабходнасць распрацоўкі турыстычных маршрутаў з паказам аб'ектаў драўлянага дойлідства [15, арк. 215–223].

Выклікаюць цікавасць дакументы аб арганізацыі дзейнасці па ахове нумізматычных помнікаў. Так, старшыня аддзялення Таварыста ў БДУ В. Н. Рабцэвіч выказваў прапановы аб стварэнні спецыяльнай памяткі для насельніцтва пра неабходнасць перадачы манетных знаходак на дзяржзахаванне ў музеі, падрыхтоўцы дакументальнай стужкі пра нумізматычныя клады Беларусі, адкрыцці пастаяннай нумізматычнай рубрыкі ў бюлетэні Таварыства, стварэнні і выданні звода-каталога нумізматычных помнікаў Беларусі, стварэнні ў рэспубліцы музея манет і манетных кладаў [14, арк. 60–63]. Неабходна адзначыць, што выказаныя прапановы ўвайшлі ў спецыяльную Пастанову Рэспубліканскай рады Таварыства і паступова ажыццявіліся: па ТБ прайшлі спецыяльныя сюжэты, на пачатку 2000-х быў падрыхтаваны «Звод нумізматычных помнікаў», а ў НГМБ была створана экспазіцыя «Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля».

Матэрыялы архіўнага фонда сведчаць, што Таварыства надавала вялікую ўвагу папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Цэнтральнымі і мясцовымі органамі Таварыства з самага пачатку дзейнасці праводзілася работа па павышэнні зацікаўленнасці дзейнасцю Таварыства сярод жыхароў Беларусі: выпускаліся радыёперадачы і ўлеткі, адбываліся сустрэчы актывістаў з насельніцтвам. Паводле захаваных дакументаў, толькі за лета–восень 1967 г. было створана 2173 арганізацыі з колькасцю удзельнікаў 105 894 чалавек [1, арк. 44; 4, арк.19, 23, 78].

На працягу ўсяго савецкага перыяда дзейнасці Таварыства выдаваліся буклеты, выпускаліся тэлеперадачы, чыталіся лекцыі для грамадскасці з удзелам спецыялістаў, праводзіліся конкурсы на лепшы грамадскі музей і аматарскі кінафільм пра помнікі гісторыі [4, арк. 1, 9, 64, 78; 8,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арк. 153; 9, арк. 17, 127–134; 14, арк. 10–21, 11, арк. 82; 15, арк. 13 ]. Сярод рэспубліканскіх СМІ абвяшчаліся спаборніцтвы на лепшае асвятленне помнікаў і дзейнасці па іх захаванні. З 1970 г. штоквартальна выдаваўся бюлетэнь Таварыства «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», які распаўсюджваўся праз сістэму «Саюздрука» [9, арк. 134; 11, арк. 80–82; 12]. Акрамя матэрыялаў непасрэдна пра аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны на старонках бюлетэня адбываўся абмен лепшым вопытам работ па ахове, рэстаўрацыі і ўключэнню помнікаў у турыстычныя маршруты [9, арк. 119–125].

Члены Таварыства адзначалі, што помнікі неабходна прапагандаваць, інакш страчваецца сэнс па іх захаванні: яны прызначаны для паказу суайчыннікам і гасцям Беларусі [3, арк. 71–72; 4, арк. 64; 9, арк. 134]. Пытанні ўключэння помнікаў у турыстычныя маршруты рэгулярна абмяркоўваліся на сумесных пасяджэннях Таварыства і Рэспубліканскага Савета па турызме і экскурсіях. У якасці важнай праблемы вызначаўся разрыў паміж павялічэннем турыстычных патокаў і станам экскурсійна-турыстычных аб’ектаў [3; 15, арк. 222–223]. Захаваліся Пастановы Рэспубліканскага савета БДТАПГК аб стварэнні новых экскурсійных маршрутаў па гістарычных частках гарадоў [10, арк. 56–62; 14, арк. 28–29].

Дзеля паляпшэння сітуацыі па захаванні помнікаў архітэктуры і археалогіі ў 1977 г. былі распрацаваны і прызначаны для ўстаноўкі знакі-дошкі з указаннем помніка [13, арк. 2; 14, арк. 24–25]. Аднак працэс рухаўся даволі марудна. Гэта акалічнасць спрыяла разрабаванню археалагічных помнікаў у рэгіёнах. Так, у справаздачы па Рагачоўскім раёне Гомельскай вобласці паведамлялася аб сапраўднай «эпідэміі кладашукальніцтва» на археалагічных помніках без удзелу спецыялістаў [13, арк. 87].

Адной з актыўных секцый Таварыства стала маладзёжная [5]. Неабходна адзначыць арганізацыю сумесных праектаў Таварыства і студэнцкай моладзі [3, арк. 43; 4, арк. 20, 30; 15, арк. 5].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адметным кірункам дзейнасці Таварыства ў савецкі перыяд стала мемарыялізацыя падзей Вялікай Айчыннай вайны. Мясцовыя аддзяленні грамадскага аб'яднання штогадова праводзілі ўлік стану наяўных ваенных мемарыялаў, вызначалі месцы, дзе помнікі неабходна пабудаваць, а таксама ўлічвалі аб'екты, якім патрабаваліся рэстаўрацыйныя работы [4, арк. 65–66; 9, арк. 132–138; 10, арк. 48–52, 14, арк. 153–154; 15, арк. 37–39; 16]. Так, па выніках праверкі 1973 г. высветлілася, што з існуючых 4717 помнікаў для 841, з іх была замена [10, арк. 17]. Вясной абласныя арганізацыі Таварыства праводзілі месячнікі па добраўпарадкаванні помнікаў баявой славы і брацкіх магіл ахвяр ваенных падзей [9, арк. 132–138]. Сярод праблем у захаванні помнікаў дакументы вызначаюць той аспект, што большасць манументаў была створаны на працягу 1950–1960-х гг. з недаўгавечных матэрыялаў і на нізкім мастацкім узроўні [18, арк. 62]. Акрамя таго, вытворчы камбінат мастацкага фонду БССР, які выконваў праекты помнікаў, быў не ў стане своечасова выканаць усе паступаючыя заяўкі [10, арк. 17].

Асабліва актыўны ўдзел у пошукава-мемарыяльнай дзейнасці бралі ўстановы адукацыі. Школьнікі разам з настаўнікамі падчас «зорных паходаў» адшуквалі і дабраўпарадкоўвалі не ўлічаныя магілы барацьбітоў і мірных жыхароў, вялі перапіску з архіўнымі ўстановамі і ваенкаматамі дзеля атрымання звестак пра байцоў, пахаваных у брацкіх магілах [4, арк. 4–10, 26–29, 31; 9, арк. 127–129].

Калі школьнікі ўдзельнічалі ў пошукавай справе, то студэнты профільных ВНУ (архітэктурны факультэт БПІ і гістарычны факультэт БДУ) працавалі на правядзенні рэстаўрацыйных работ на архітэктурных аб'ектах [3, арк. 43]. З мэтай больш дасканалага вывучэння помнікаў архітэктуры і археалогіі распрацоўваліся тэмы курсавых і дыпломных работ. Студэнты архітэктурнага факультэта актыўна ўдзельнічалі ў конкурсе на лепшы плакат, прысвечаны помнікам мастацтва БССР [4, арк. 1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арганізаваныя Таварыствам конкурсы на лепшы грамадскі музей і зорна-пошуковыя паходы спрыялі музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны рэспублікі [8, арк. 150–153; 9, арк. 17]. Мясцовыя аддзяленні звярталіся да кіраўніцтва Таварыства аб неабходнасці заахвочвання лепшых школьных настаўнікаў, актывістаў музейнай справы. Сярод дакументаў фонду захаваліся матэрыялы пра дзейнасць кіраўніка музея Чапялёўскай СШ Салігорскага раёна В. К. Ванкулевіча [8, арк. 129–149].

Вывучэнне архіўнага фонду БДТАПГК дазваляе канстатаваць, што ў савецкі перыяд дзякуючы дзейнасці Таварыства быў закладзены грунтоўны падмурак для захавання і актуалізацыі нашай гісторыка-культурнай спадчыны: правільна вызначаны асноўныя праблемы і шляхі іх перадолення, створаны «Звод помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», праведзены ці распачаты работы па рэстаўрацыі і добраўпарадкаванні помнікаў, Таварыствам прыкладзены вялікія намаганні па папулярызацыі і музеефікацыі айчыннай спадчыны сярод насельніцтва і гасцей Беларусі.


*1.* Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі (БДАНТД). Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 1.
*2.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 5.
*3.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 17.
*4.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 22.
*5.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 24, 182.
*6.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 26. т. 1.
*7.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 50.
*8.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 56.
*9.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 58.
*10.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 59.
*11.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 94.
*12.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 107.
*13.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 123.
*14.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 126.
*15.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 212.
*16.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 1 уд. Спр. 250.
*17.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 3 уд. Спр. 1.
*18.* БДАНТД. Ф. 297. Воп. 3 уд. Спр. 8.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

19. *Пирумян, К. С.* Организация охраны памятников археологии на территории (1965–1985 гг.): постановка проблемы / К. С. Пирумян // Вестник Полоцкого университета. Серия А. Гуманитарные науки. – № 9. – 2017. – С. 94–99.

# АРХИТЕКТУРНО-ДЕКОРАТИВНЫЕ ПРИЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ ТЕАТРАЛЬНЫХ СООРУЖЕНИЙ САНТЬЯГО КАЛАТРАВЫ

***М. С. Писарчик,** аспирант Белорусского государственного университета культуры и искусств*

Архитектура театральных сооружений насчитывает многовековую историю развития. К началу XXI века в театральной архитектуре были представлены различные, накопленные веками, типы формообразования и художественно-декоративного оформления, что сформировало общее понимание, как должно выглядеть театральное сооружение. В данном исследовании мы обратимся к примеру совершенно новой театральной архитектуры, ярчайшим представителем которой является испанский архитектор Сантьяго Калатрава (род. в 1951 г.). В его оперных театрах Санта Крус и Валенсии навсегда исчезли ордерные портики, квадриги, Аполлоны с музами, гипсовые маски. Само театральное сооружение становится своеобразной выразительной маской, прикрывающее внутреннюю, технологичную сущность архитектурно-декоративного решения зала и сцены [1, с. 59]. По мнению профессора, доктора архитектуры А. В. Анисимова, «современный театр как архитектурный объект утратил свои знаковые символы, но приобрел новое, выразительное лицо, соответствующее современному городу» [1, с 57]. Формообразование театра Калатравы поражает зрителей не меньше, чем представленные спектакли на его сцене. Поэтому автора данных театральных сооружений можно считать своеобразным «режиссером» архитектуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ